ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1989
ЧАЦВЕР
16
САКАВІКА
№ 9(1602)

НЕ Ў БРЫВО, А Ў ВОКА

«Бі першым, Федзя!» 12.01.89.

НЕЗАДОЎГА пасля апублікавання артыкула «Бі першым, Федзя!» рэдакцыя газеты атрымала афіцыйны адказ ад кіраўніцтва механіка-матэматычнага факультэта. Дэкан Л. П. Прымачук паведаміў, што факт ганебных паводзін у інтэрнаце студэнта III курса Д. Мазепіна сапраўды меў месца.

Так, 22 снежня 1988 года Д. Мазепін разрадзіў вогнетушыцель у холе адзінаццатага паверха інтэрната № 7 і гэтым нанёс універсітэту матэрыяльны ўрон на суму 46 руб. 64 кап. Пры вынясенні спагнання кіраўніцтва факультэта ўлічыла, што да таго часу студэнт кампенсаваў неабходную суму. І ўсё ж загад быў строгім: «За парушэнне правілаў сацыялістычнага сумеснага жыцця аб'явіць студэнту III курса мехмата Мазепіну Д. С. строгую вымову і пазбавіць яго права на пражыванне ў інтэрнаце».

Што датычыць Галіны Вярбіцкай, то, калі верыць словам дэкана факультэта Леаніда Платонавіча Прымачука, яе проста абгаварылі, наўмысна сфабрыкаваўшы дакладную у дэканат. У студэнцкім гарадку пераконвалі, быццам напісаў яе вячэрні камендант інтэрната № 7, дзе жыве дзяўчына. Але, зверыўшы почыркі, моцна засумняваліся ў гэтым (ды і сам студэнт здзівіўся, пачуўшы такі довад). Ёсць падставы думаць, што кіраўніцтва студэнцкага гарадка і інтэрната № 7, шукаючы «злачынцу», пайшлі па шляху (не заўсёды правільным) найменшага супраціўлення — назвалі зламыснікам таго, хто аказаўся менш хітрым, пакінуўшы, праводзячы гасцей, на вахце пропуск.

Спадзяёмся, гэты выпадак чаму-небудзь навучыць адказных работнікаў студэнцкага «другога дома». Перш чым нешта рабіць, патрэбна думаць і абавязкова ставіць сябе на месца іншага. Магчыма, тады і адносіны паміж студэнтамі і інтэрнацкім кіраўніцтвам будуць не такія напружаныя і амаль што варожыя (у час размовы з апошнімі карэспандэнт упэўніўся ў гэтым ўвачавідкі).

ТЭЛЕТАЙП БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ — УМОРА · ЭЁННЯ · ЗАЎТРА

ТРЫ АСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ

хвалююць сёння ідэалагічную камісію партыйнага камітэта універсітэта. Яны і былі ў цэнтры ўвагі на яе пасяджэнні:

— якія меры дапамогуць кансалідаваць маральна-палітычную абстаноўку ва універсітэце і ў горадзе?

— як вярнуць у партыйныя арганізацыі ленінскае разуменне прынцыпу партыйнай таварыскасці?

— як пры абмеркаванні ўсіх праблем прытрымлівацца рамак сацыялістычнага плюралізму?

На пасяджэнні прысутнічалі члены ідэалагічнай камісіі парткома і намеснікі сакратароў цэхавых партыйных арганізацый. На ім выпрацаваны мерапрыемствы па павышэнню актыўнасці камуністаў у палітычнай рабоце, якія будуць перададзены ў цехавыя партыйныя арганізацыі.

Т. ДОЎНАР.

СПАРТАКІЯДА ВНУ

рэспублікі па класічнай барацьбе сабрала шмат удзельнікаў: ІФК, Гомельскі і Гродненскі дзяржаўныя універсітэты, РТІ, Віцебскі ветэрынарны інстытут і іншыя. Каманда нашага універсітэта заняла другое месца, уступіўшы вышэйшую прыступку п'едэсталу гонару зборнай Інстытута фізічнай культуры. На трэцім месцы — спартсмены Гродзенскага універсітэта.

У асабістым першынстве былі вызначаны тры першыя месцы — іх занялі К. Маджыдаў, С. Дземяшкевіч, А. Плотнікаў (юрфак); два другія — Ул. Кунцэвіч, К. Буднік (геафак) і два трэція — В. Мядзведскі (філфак) і В. Карпоўскі (ФПМ).

В. РУДЗЯНКОЎ.

МАНАЛОГ ЗАЦІКАЎЛЕНАГА ЧАЛАВЕКА

Плён пад адхон

Славутая Эйфелева вежа і тая, пэўна, здзівілася б неўтаймаваным «капрызам» шматпакутных універсітэцкіх будынкаў. Утаймаваць або, лепш сказаць, адрамантаваць іх спрабавалі на працягу некалькіх год запар. Кідалі ў цесныя, пашарпаныя аўдыторыі, у брудныя, няўтульныя, негігіенічныя інтэрнаты сотні тысяч рублёў для аднаўлення, а становішча не паляпшалася. Усе меры былі падобны да антыбіётыкаў, якія толькі часова знімалі, прыглушвалі боль, заганяючы хваробу ўглыб. Таму з кожным годам рос лік аварыйных вучэбных карпусоў і інтэрнатаў (зараз з пяцідзесяці універсітэцкіх збудаванняў больш паловы патрабуюць капітальнага рамонту).

Спыніць разбурэнне сіламі сумяшчальнікаў, часовых сантэхнікаў, электрыкаў, муляраў, столяраў, слесараў было марным намаганнем. У гэтых людзей пасля іх асноўнай работы на прадпрыемстве не заставалася для працы ва універсітэце ні часу, ні ахвоты, ні сілы, ні магчымасці давесці да ладу састарэлыя пабудовы. Выратавальным кругам аказалася... скарачэнне штатаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. Замест 760 чалавек цяпер працуе 535, і як працуе! Літаральна на вачах ажылі інтэрнаты №№ 2, 3, 4, 6, паступова набываюць новае аблічча вучэбныя корпусы.

У іх з'явіліся сапраўдныя гаспадары — комплексныя брыгады. Кожная такая брыгада мае ва універсітэце свой аб'ект, адказвае за яго захаванасць і непарушнасць. Няма нараканняў і на якасць работ, бо за брак даводзіцца плаціць з уласнай кішэні. Узнікла зацікаўленасць людзей хутчэй здаць аб'ект у эксплуатацыю цалкам, таму што заробак у комплексных брыгадах атрымліваюць па канчатковым выніку працы. Здавалася, ў рэшце рэшт выйсце знойдзена, адрамантаваць універсітэцкія памяшканні — справа часу і майстэрства комплексных брыгад. Толькі... Не паспеюць рамонтнікі выйсці за парог адноўленых будынкаў, як адтуль чуецца жалобны звон пабітага шкла і трэск зламанай мэблі. І што самае дзіўнае, вінаватых амаль ніколі не бывае, усё на сумленні яго Вялікасці Выпадку. За год вось так «выпадкова» разбіваецца каля трох тысяч квадратных метраў аконнага шкла, затраты на пашкоджаную мэблю складаюць 20 тысяч рублёў. А як вызначыць маральныя затраты рамонтнікаў? Яны ж, па сутнасці, займаюцца «сізіфавай працай». Зрэшты, ахвярамі свайго свавольства становяцца і студэнты. Колькі скарг паступае на жыллёвыя нязручнасці ў сувязі з рамонтам у інтэрнатах № 7, № 5, дзе не так даўно «шчыравалі» столяры, сантэхнікі, муляры, ды і ў вучэбных корпусах з «адгравіраванымі» сталамі і «кульгавымі» крэсламі займацца не вельмі зручна. Аднак, на жаль, разумеюць гэта студэнты толькі пасля таго, як уласнаручна прывядуць у непрыгоднасць і сваё жыллё, і аўдыторыі.

Даўно вядома, што не там чыста, дзе мятуць, а там, дзе не брудзяць. Навесці парадак у студэнцкім доме, зрабіць яго ўтульным і прыгожым — клопат рамонтнікаў, астатняе — справа сумлення і культуры студэнтаў.

У. ТАРАСЕВІЧ,
прарэктар па АГЧ.

Відэа-кафэ «Гаўдэамус»

запрашае правесці Дзень імянінніка, пасвячэнне ў студэнты, іншыя ўрачыстасці і проста адпачыць: патанцаваць, паглядзець цікавую відэапраграму, сустрэцца з сябрамі за кубкам кавы.

Калектыў, які вядзе музычную праграму,— лаўрэат гарадскога конкурсу самадзейных калектываў.

Час работы кафэ — з 19.30 да 23.00 гадзін. Кошт уваходнага білета — 1 рубель. Іх можна набыць з 13 да 14 гадзін штодня ў п. 302 галоўнага корпуса універсітэта або непасрэдна пры ўваходзе ў кафе. Прымаюцца таксама папярэднія і калектыўныя заяўкі.

Рады вітаць вас у нашым кафэ. Дарэчы, не забудзьцеся прыхапіць студэнцкі білет.

ФОТА Ў НУМАР



Андрэй Мядзведзеў — студэнт чацвёртага курса фізічнага факультэта, акрамя навуковай работы рэдагуе насценгазету кафедры.

— Ці шмат нумароў выйшла?

— Два. Рыхтуем трэці.

— Крытэрыі ацэнкі працы рэдактара?

— Галоўнае, каб чыталі. І чытаюць. Каго не хвалюе, напрыклад, праблема размеркавання гадзін для выкладання спецкурсаў?

— І што, ужо ёсць зрухі?

— Дабіліся пераразмеркавання. Хоць гэта і палова справы, але станоўчы вынік дае. Работу будзем працягваць.

Фота С. ГРЫЦА.

АДДЗЯЛЕННЕ СУВЯЗІ

Як студэнту стаць інтэлігентам?

Заняткі працягваюцца. Выкладчык гаворыць — студэнт слухае. Звычайная сітуацыя, існуючая дзесяцігоддзямі практыка павучання, уцёкі ад нецікавых мерапрыемстваў, добраахвотна - прымусовых сходаў, дзяжурстваў, рамонтаў, ДНД. Усяго таго, што складае нашы лепшыя гады — гады студэнцтва.

Каго рыхтуюць ва універсітэце? Спецыялістаў, майстроў сваёй справы. А як наконт адукаваных людзей, інтэлігентаў?

Калі першае паняцце вызначаецца адназначна: спецыяліст — гэта чалавек, які валодае комплексам неабходных ведаў, навыкаў для выканання пэўнай работы, то другое вызначыць значна цяжэй. Давайце азірнемся назад і ўсвядомім, што вышэйшая адукацыя, скажам, у Расіі XIX стагоддзя, стварыла клас інтэлігенцыі. У слоўніку Ушакова «інтэлігент» тлумачыцца як «разумны, культурны, разумеючы, духоўны». Ці можам мы сказаць, паклаўшы руку на сэрца, што сённяшні выпускнік валодае ўсімі гэтымі якасцямі? Безумоўна, не.

Перабудова адукацыі жыццёва неабходна. І ўзяцца за яе павінны мы, студэнты.

Першае — вольнае наведванне. Магу з упэўненасцю сказаць, што да вольнага наведвання лекцый мы не падрыхтаваны, хоць аўдыторыя вельмі чула рэагуе на якасць таго матэрыялу, які ёй прапануюць, і спосаб яго выкладання. Але дзеля таго, каб вольна наведваць лекцыі, патрэбна дакладна разумець, што неабходна для будучай прафесіі больш за ўсё. А хіба студэнты малодшых курсаў могуць думаць гэтак дыферэнцыравана? Увёўшы вольнае наведванне, мы наўрад ці налічым на першых парах хаця б чвэрць студэнтаў.

Другое. Як дабіцца ад студэнтаў жадання добра вучыцца? Добра, калі патрэбна стыпендыя. Тут ужо хочаш ці не, а зробіш усё магчымае, каб тройку ці незалік не паставілі. Ну, а калі стыпендыя не патрэбна? Можа, лепш было б тады ўвесці плату за пераздачу? Своеасаблівы гаспадарчы разлік, пры якім з-за боязі за свой і так худы кашалёк, студэнт міжволі будзе брацца за розум. Варыянтаў многа.

Хачу напомніць, што атрымаць адукацыю і стаць адукаваным чалавекам — гэта зусім розныя рэчы. І пра гэта забываць нельга. Адна з важнейшых заваёў сацыялізму — бясплатная адукацыя. Дык давайце ж выкарыстоўваць яе, а не выязджаць на гэтым.

Дзмітрый КІРЫЛАЎ,
студэнт факультэта журналістыкі.

Не дзеля прэстыжу...

Многія знаёмыя дзесяцікласнікі мараць аб паступленні ў Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна. Усюды гавораць: «Гэта самая прэстыжная вышэйшая навучальная ўстанова ў рэспубліцы». Слухаеш і, шчыра кажучы, маленькі кар'ерыст, які жыве, пэўна, у кожным з нас, пачынае патрабаваць задавальнення свайго сябелюбства. Чаму б не паспрабаваць? Не толькі дзеля прэстыжу. Дзесяцікласніца Наталля Трыбіс спадзяецца, што універсітэт здзейсніць яе мару — стаць выкладчыкам мовы і літаратуры. Люба Трафімава лічыць, што атрымае тут трывалыя веды па матэматыцы. А Наталлю Міхайлаву цікавіць, як развіваліся адносіны паміж народамі, непакоіць жаданне разгадаць, чаму краіна, народ якой перамог, здаецца, усе злыя сілы, апынулася за крок да эканамічнай катастрофы, а праўда доўгі час была не ў пашане.

Я бачу сябе студэнткай журфака. Як сустрэне ўсіх нас універсітэт, залежыць ад падрыхтоўкі і здольнасцей кожнага. Мы хвалюемся: да паступлення засталося чатыры месяцы.

Наталля ІВАНЕНКА,
дзесяцікласніца СШ № 148
г. Мінска.

ЕСЦЬ НАВІНА!

Першая беларуска-польская

НА ПРАЦЯГУ стагоддзяў Кракаў быў адным з важнейшых цэнтраў славянскай навукі і культуры, які гасцінна прымаў і выхадцаў з суседняй Беларусі. З горадам шматлікіх сусветна вядомых помнікаў даўніны звязаны імёны Ф. Скарыны, С. Буднага, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, М. Федароўскага, А. Кіркора. Менавіта тут упершыню пазнаёміўся з кнігадрукаваннем Ф. Скарына, у кракаўскай друкарні пана Анчыца ў 1891 годзе выйшла славутая «Дудка беларуская» Ф. Багушэвіча...

На некалькі дзён у лютым Кракаў стаў месцам жыхарства цэлай групы беларускіх мова- і літаратуразнаўцаў. Тут у Ягелонскім універсітэце прайшла першая навуковая сесія «Польска-беларускія літаратурныя сувязі», арганізаваная Інстытутам польскай філалогіі і Белдзяржуніверсітэтам імя У. І. Леніна. На працягу двух дзён было заслухана і абмеркавана 10 дакладаў, прысвечаных самым розным праблемам тыпалагічнага даследавання літаратур і моў двух суседніх славянскіх народаў.

На першым пасяджэнні з дакладамі выступілі загадчык кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна прафесар А. А. Лойка (даклад на тэму «Ф. Скарына — дзеяч Адраджэння»), доктар Ягелонскага універсітэта М. Татара («Чаго чакае гісторык польскай літаратуры ад гісторыка беларускай літаратуры»), дацэнт БДУ У. Г. Кароткі («Рэлігійна-палемічная літаратура на Беларусі ў XVII ст.»). Першыя даклады настолькі захапілі слухачоў, што старшыні сесіі з цяжкасцю ўдавалася вытрымліваць устаноўлены рэгламент для апанентаў і жадаючых выступіць у спрэчках. З цікавасцю былі ўспрыняты даклады і іншых удзельнікаў сесіі. Ад БДУ імя У. І. Леніна выступілі: выкладчыца Л. А. Ламека («Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча — «Новая зямля» К. Міцкевіча — Я. Коласа»), выкладчык В. К. Каратай («Сучасная філасофская паэма ў беларускай літаратуры»), дацэнт Л. К. Тарасюк («Я. Купала — народны паэт Беларусі»), прафесар Д. Я. Бугаёў («Беларуская літаратура ў кантэксце сталінскіх рэпрэсій») і аўтар гэтых радкоў — «Беларуска-польскія моўныя кантакты: здабыткі і перспектывы». Былі абмеркаваны таксама даклады дактароў Ягелонскага універсітэта К. Важнякоўскага («Польскае літаратурнае асяроддзе ў Савецкай Беларусі ў 1919—1989 гг.»), А. Рамаоўскага («Польскае нацыянальнае адраджэнне ў Беларусі пасля 1905 года»).

Ход сесіі падрабязна асвятляўся сродкамі друку, радыё і тэлебачання Кракава. Госці з Беларусі ўсклалі кветкі на магілу паэта Алеся Гаруна, пазнаёміліся са славутасцямі старажытнай польскай сталіцы, яе ваколіцамі. На заключным пасяджэнні вырашана наступную сесію правесці ў кастрычніку на філалагічным факультэце нашага універсітэта.

М. ПРЫГОДЗІЧ,
дацэнт кафедры беларускай мовы.

Дзейнасць і барацьба палкаводца М. В. Фрунзе, жыццё сучаснай міліцыі і крымінальнага вышуку і, нарэшце, незагойная рана нашай памяці, нашых сэрцаў — Афганістан. Аб гэтым піша свае кнігі Мікалай Іванавіч Чаргінец, работнік Міністэрства Унутраных Спраў, беларускі пісьменнік. Сустрэча з ім адбылася на юрыдычным факультэце.



Назвы кніг добра вядомы чытачам: «Чацвёрты след», «Фінал Краба», «Вам заданне», «За секунду да стрэлу», «Тайна Чорных гор».

Мікалай Іванавіч прайшоў, не мінаючы, усе прыступкі службовай лесвіцы, пачынаючы з аператыўнага работніка крымінальнага вышуку. Менавіта гэта работа дала пісьменніку багаты жыццёвы матэрыял. Кнігі яго прызнаны, чытач палюбіў іх.

Волей лёсу Міхаіл Іванавіч апынуўся ў Афганістане, правёў на вайне тры цяжкія гады. Першая яго кніга пра падзеі ў краіне называлася «Тайна Чорных гор». У гэтыя часы пра Афганістан і пахавальныя ў нашых дамах гаварылі напаўголаса. Час быў такі. Таму афіцыйны аловак цэнзара добра папрацаваў на старонках рукапісу, каб згладзіць выразы, прыбраць красамоўныя дэталі, дабавіць ружовага колеру. Сёння афганскія радкі Мікалая Іванавіча поўныя балючай праўды. Усе праблемы, звязаныя з гэтай вайной, ён ведае, і лічыць сваім абавязкам данесці да людзей праўду, якую хавалі доўгія гады.

С. ГРЫЦ.
Фота аўтара.

ДАІ ІНФАРМУЕ

Сцеражыся аўтамабіля!

АСАБЛІВА, калі на ім нумарны знак, які ўказвае на прыналежнасць Белдзяржуніверсітэту. Групу рызыкі складаюць 25 з 62 універсітэцкіх аўтамабіляў. Кіраўніцтва аўтагаспадаркі не палічыла патрэбным г[illegible] даставіць гэты транспарт для [illegible]нічнага агляду ў ДАІ. Відаць, няма цвёрдай упэўненасці ў спраўнасці аўтамашын. Вось і імчаць яны штодзень у рознакаляровай плыні аўтамабіляў, здольныя ў любы момант выйсці з пакорнасці вадзіцелю і натварыць бяды.

Не меншую трывогу выклікаюць транспартныя сродкі індывідуальных уладальнікаў, бо, як правіла, і тут амаль усе аварыі на рахунку няспраўных машын і матацыклаў. Сёлета ДАІ вырашыла правесці перыядычны тэхнічны агляд асабістага транспарту жыхароў Маскоўскага раёна з 29 сакавіка па 7 красавіка. Для ўладальнікаў матацыклаў і матаролераў намечаны больш позні тэрмін — 19, 21 і 22 чэрвеня.

Вадзіцелям неабходна мець пры сабе:

— пашпарт;

— тэхнічны пашпарт на аўтамабіль (матацыкл, матаролер);

— талон тэхнічнага пашпарта (для прычэпа);

— вадзіцельскае пасведчанне і медыцынскую даведку;

— квіток аб уплаце падатку з уладальнікаў транспартных сродкаў (калі транспартны сродак эксплуатуецца па даверанасці, квіток прадастаўляецца на імя ўладальніка).

Зрэшты, не абавязкова праходзіць тэхнічны агляд у ДАІ. Яго могуць правесці і на станцыі тэхнічнага абслугоўвання. У такім разе ў Дзяржаўтаінспекцыю прадастаўляюцца ўсе вышэйназваныя дакументы, акрамя таго, даведка з СТА, талон праверкі саставу адпрацаваных газаў і транспартны сродак.

У выпадку немагчымасці прайсці тэхнічны агляд, у ДАІ неабходна прадаставіць тэхнічны пашпарт і квіток аб уплаце налога з уладальніка транспартнага сродку для рэгістрацыі.

У. КРУМКАЧ,
старшы дзяржаўтаінспектар Маскоўскага РАУС г. Мінска.

З КАМПЕТЭНТНЫХ КРЫНІЦ

Спыніце выбар на дастойных

Некалькі дзён аддзяляюць нас ад нядзелі 26 сакавіка, калі адбудуцца выбары народных дэпутатаў СССР. Напярэдадні мы папрасілі загадчыка арганізацыйна-інструктарскага аддзела гарвыканкома Я. Л. ЯНКОВІЧА расказаць аб парадку правядзення выбараў, растлумачыць сэнс новаўвядзенняў.

— Аб ходзе падрыхтоўкі да выбараў напісана ўжо шмат. Хацелася б атрымаць больш падрабязную інфармацыю аб працэсе галасавання, які ўключае шмат новых, часам нязвычных для нас момантаў.

— Перш за ўсё патрэбна мець на ўвазе, што ўся адказнасць за арганізацыю і правядзенне галасавання (у адпаведнасці з Законам аб выбарах), забеспячэнне тайны волевыяўлення, апавяшчэнне аб часе і месцы галасавання, складанне спісаў выбаршчыкаў, абсталяванне памяшканняў і падтрыманне парадку ў іх ускладзена на ўчастковыя выбарчыя камісіі. Яны з'яўляюцца гаспадарамі на выбарчых участках і іх патрабаванні павінны выконваць як выбаршчыкі, так і прадстаўнікі грамадскіх і дзяржаўных органаў. Ніхто не мае права ўмешвацца ў іх работу.

Адно з істотных новаўвядзенняў сёлетніх выбараў — аптымізацыя часу пачатку і заканчэння галасавання. Законам устаноўлена, што галасаванне ў дзень выбараў будзе праводзіцца з 7 да 20 гадзін. Зыходзячы са шматгадовай практыкі правядзення выбараў, пераканаліся, што большая колькасць галасуючых можа зрабіць гэта ў названы час.

— У час выбараў у вышэйшы орган дзяржаўнай улады ўпершыню ў выбарчых бюлетэнях большасці акруг мінчане ўбачаць па два, а ў некаторых і па тры кандыдаты ў дэпутаты...

— Так, напрыклад, па Мінскай—Ленінскай № 563 і Мінскай — Савецкай № 566 тэрытарыяльных акругах, а таксама па Мінскай — Цэнтральнай нацыянальна-тэрытарыяльнай выбарчай акрузе № 68 зарэгістравана і ўнесена ў выбарчыя бюлетэні па тры кандыдаты. У іншых акругах па два. І толькі ў Мінскай — Першамайскай нацыянальна-тэрытарыяльнай выбарчай акрузе № 66 — адзін кандыдат.

Гэта ўскладняе сітуацыю, бо перавагу патрэбна аддаць аднаму кандыдату. Калі ж у бюлетэні застанецца больш чалавек, ён лічыцца несапраўдным. Гэта значыць, што выбаршчык, які апусціў у скрыню такі бюлетэнь, самаўхіліўся ад галасавання.

— Яўген Леанідавіч, раскажыце, калі ласка, больш падрабязна аб парадку правядзення галасавання.

— Кожны выбаршчык, атрымаўшы бюлетэнь, павінен прайсці ў кабіну для тайнага галасавання і запоўніць яго, дакладней, пакінуць у ім толькі прозвішча таго кандыдата, за якога ён галасуе, а прозвішчы астатніх выкрасліць. Што датычыць прозвішчаў грамадзян, дадаткова ўпісаных у бюлетэні, то галасы падлічвацца не будуць. Таму такім чынам уносіць свае прапановы няма сэнсу. Пры запаўненні бюлетэня ў кабіне для тайнага галасавання забаронена прысутнасць пабочных людзей. Аднак, у тым выпадку, калі выбаршчык не можа сам запоўніць бюлетэнь, ён мае права запрасіць у кабіну іншую асобу, акрамя члена выбарчай камісіі.

Пытанне «Чыё прозвішча пакінуць у выбарчым бюлетэні?» — галоўнае пытанне выбараў. І кожнаму выбаршчыку неабходна загадзя ведаць, хто балаціруецца кандыдатамі ў народныя дэпутаты СССР па акрузе, высветліць іх праграмы і дакладна вызначыць, каму аддаваць перавагу. І ўсё гэта патрэбна зрабіць напярэдадні, таму што агітацыя ў дзень выбараў забараняецца.

— Ці маю права я прыйсці і прагаласаваць, напрыклад, за іншага чалавека?

— Як паказвае практыка правядзення выбараў, нярэдка здараецца, што на выбарчы ўчастак прыходзяць «дэлегаты» са стосам пашпартоў сваіх родных, а часам і суседзяў або сяброў, каб прагаласаваць за іх. Хацелася б звярнуць увагу выбаршчыкаў на тое, што гэта грубае парушэнне Закона аб выбарах народных дэпутатаў, і члены выбарчай камісіі не павінны выдаваць бюлетэні такім «дэлегатам».

— А калі выбаршчык па ўважлівай прычыне, напрыклад, па стану здароўя, не зможа прыйсці на галасаванне?

Тады ўчастковая камісія па яго просьбе можа даручыць сваім членам арганізаваць галасаванне непасрэдна на месцы яго знаходжання. Аднак, паўтараю, гэта павінна быць рэдкім выключэннем. Справа гонару і сумлення кожнага грамадзяніна — выкарыстанне свайго канстытуцыйнага права прыйсці на выбарчы ўчастак і ўдзельнічаць у выбарах народных дэпутатаў СССР.

— Часам здараюцца выпадкі, калі выбаршчык, атрымаўшы бюлетэнь, не галасуе, а спрабуе забраць яго з сабой.

— Усе мы павінны ведаць, што члены ўчастковай выбарчай камісіі нясуць адказнасць за захаванасць усёй дакументацыі, у тым ліку і бюлетэней, на выбарчым участку, таму яны маюць права патрабаваць, каб бюлетэнь вярнулі.

— Для ажыццяўлення грамадскага кантролю і галоснасці ў час падліку галасоў і на пасяджэнні камісіі могуць прысутнічаць прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый, сходаў выбаршчыкаў, даверaныя асобы, а таксама прадстаўнікі друку, радыё і тэлебачання...

— Але паўнамоцтвы такіх прадстаўнікоў абавязкова павінны быць пацверджаны адпаведным дакументам, аб чым неабходна загадзя папярэдзіць выбарчую камісію. Прысутнасць іх пры падліку галасоў і на пасяджэнні камісіі не дае права аказваць націск на членаў камісіі ці ўмешвацца ў яе работу і рашэнні. Кантроль за работай участковых камісій ажыццяўляе адпаведная акруговая камісія, таму пры неабходнасці выбаршчыкі могуць звярнуцца з заявай туды.

І яшчэ хачу дадаць. Паведамленні аб выніках выбараў па акругах будуць надрукаваны, як устаноўлена цэнтральнай выбарчай камісіяй, не пазней 28 сакавіка 1989 года.

Спадзяёмся, што вы, прыйшоўшы на выбарчыя ўчасткі, выбераце народнымі дэпутатамі СССР самых дастойных кандыдатаў.

Запісала
З. АЛЯШКЕВІЧ.

Кэн і Дэвід, якія адкрывалі для сябе «скрытных» рускіх

Усхваляваная маці няпэўную ідэю Кэна аб падарожжы ў Савецкі Саюз успрыняла без захаплення. І хоць не дакладна ўяўляла сабе, як выглядаюць «гэтыя рускія», у адносінах да свайго сына чакала ад іх самага непрадбачанага.

Адна знаёмая Дэвіда амаль што палічыла яго за вар'ята. Што там можна ўбачыць? Рускія многа гавораць аб перабудове, толькі ўсё гэта (яна пераканана) — бал-бат-ня.

Толькі «Гонтліт», на чыіх старонках не раз змяшчаліся рэпартажы з Нікарагуа, Гандураса, Амерыкі, і на гэты раз не спяшалася пярэчыць. Без сенсацыйных матэрыялаў яна страціла б статус лепшай у Калгары (па даным Кэна), а, магчыма, і ва ўсёй Канадзе (па папраўцы Дэвіда). Куды толькі падзенуцца тыя 12 тысяч студэнтаў універсітэта г. Калгары, якія ашчаджаюць на выданне сваёй газеты па тры долары ў месяц. Наўрад ці застанецца ранейшым і працэнт яе распаўсюджання (чвэрць ад тыражу) за межамі універсітэцкага гарадка.

Як руплівыя гаспадары, сарэдактары Кэн Шмальц і Дэвід Газард непакояцца, каб попыт на газету ніколі не зніжаўся. Аднак у Савецкі Саюз яны прыехалі не толькі на «лоўлю» сенсацыі.

Чалавек, які вымушаны жыць з заплюшчанымі вачыма, прыслухоўваецца ўдвая ўважлівей. Абвостраны слых Кэна і Дэвіда яшчэ задоўга да паездкі імкнуўся ўвабраць у сябе ўвесь асцярожны струменьчык інфармацыі з невядомага свету.

«Джынсы каштуюць у іх шалёныя грошы». Жарт ці безумоўная хлусня заходняй прэсы? Паведамленні агенцтваў аб галоснасці, перабудове, дэмакратызацыі грамадства. А што, калі гэта толькі маска, якой рускія карыстаюцца пераважна ў час з'яўлення на старонках замежных выданняў?

Заплюшчаным вачам ніколі не адлюстраваць рэальную рэчаіснасць. Адкрыццё адбудзецца адразу ж пасля абуджэння.

Недавер маці да рускіх Кэн не падзяляе. Хоць і яго нямала здзіўляе, што маладыя людзі ў Савецкім Саюзе вельмі паходзяць на канадскіх: у многіх выпадках дзейнічаюць падобна, непакояцца аб адным і тым жа, нават словы для выказвання сваіх адносін да той ці іншай справы выкарыстоўваюць эквівалентныя.



Кэн прызнаецца: не чакаў і таго, што (ну, зусім, як канадскія дзеці) смешна і нязграбна, пэцкаючы ружовую сукеначку, ніколькі не саромеючыся чужога дзядзі, здзіўляючыся хіба толькі незразумелай гаворцы, будзе есці падараную шакаладку Марынка Шумская — наша выпадковая спадарожніца ў час экскурсіі ў Брэсцкую крэпасць.

Пытанне «А чым мы, студэнты, адрозніваемся і чым падобныя на савецкіх?» журналісты Шмальц і Газард дасканала вывучалі на працягу ўсяго тыдня. Заканамернае яно не толькі таму, што Дэвід — студэнт універсітэта г. Калгары пятага года навучання па спецыяльнасці англійская мова і літаратура, а Кэн — другога. Аб гэтым абавязкова запытаецца чытач «Гонтліта» — на год сарэдактарам давялося пакінуць вучобу. Добра гэта ці дрэнна? Грошы невялікія — 800 долараў у месяц. Гэта мінус. Магчымасць назапашвання вопыту, на думку Кэна, пераважвае ўсё. Дэвід такое перакананне шчыра падтрымлівае — спадзяецца пасля «Гонтліта» стаць пастаянным аўтарам газеты «Нью-Йорк Таймс».

Якія з нашых студэнцкіх спраў могуць быць для іх таямніцай? Наведваем лекцыі, праседжваем у чытальнях, ніколі не адмаўляемся ад кавы за столікам кафэ. Усё аднолькавае і вядомае? Амаль...

У Калгары ні легкадумная студэнтка, ні шаноўны прафесар не адказалі б вам на пытанне: «Што такое прахадны бал?»

— Дык вы, браточкі, можаце лічыць сябе шчасліўчыкамі, бо апынуліся тут! — усклікнуў, не стрымаўшыся, Дэвід, калі, нарэшце, разблытаў усе складанасці конкурснай сістэмы адбору. Ва універсітэце Калгары конкурсаў не бывае. Маеце 486 долараў? Вам забяспечаны семестр вучобы на большасці факультэтаў. На інжынерным факультэце кошт гадавога курса дасягае сумы ў 608 долараў, а на медыцынскім — 1000. Калі ёсць фінансавыя цяжкасці, дастаткова толькі звярнуцца з просьбай аб пазыцы і заявіць аб сваіх прымнажэннях, укладах і прадугледжваемым бюджэце на наступны акадэмічны год. Выплата — праз 6 месяцаў пасля заканчэння вучобы. Але свае складанасці мае і гэта сістэма. Ва універсітэце не хапае месца для правядзення лекцый і заняткаў: у лекцыйнай зале, разлічанай на 350 месцаў, студэнты вымушаны сядзець у праходах, а групы старшакурснікаў раздутыя ў два-тры разы. Колькасць студэнтаў давялося абмяжоўваць. Сотням з іх адмоўлена ў прыёме.

Канадскія студэнты самі выбіраюць сабе курс лекцый, выкладчыка, які іх чытае.

— Не па прынцыпу: хачу-не хачу, а па ступені неабходнасці курса ў далейшым жыцці. Можна авалодаць адной спецыяльнасцю, што зусім нескладана, калі зацікаўлены і студэнт, і выкладчык, а потым працягваць вучобу па другой. Былі б толькі грошы,— паведаміў нам Дэвід. А Кэн растлумачыў, што ў любым выпадку трэба разлічваць свае сілы. З ім не раз здаралася такое: патрэбныя яму лекцыі маглі апынуцца па раскладу адна за адной на ўвесь дзень. Гэта, сапраўды, не вельмі прыемна, калі вучышся па шаснаццаць гадзін у суткі.

Многія праблемы вучобы, быту, арганізацыі адпачынку і аховы правоў студэнтаў вырашае Студэнцкі савет, які фінансуецца за кошт добраахвотных ахвяраванняў студэнтаў і ўласнага бізнесу: бараў, кафэ, кафетэрыяў у студэнцкім гарадку і за яго межамі. Без удзелу Студэнцкага савета не могуць разглядацца пытанні павышэння платы за навучанне. Яго рашэнні не адменіць ні Вучоны савет, ні Сенат, у які ўваходзяць звычайна самыя вядучыя выкладчыкі.

Аб усім гэтым даведаліся тыя, хто прымаў удзел у сустрэчах з Дэвідам Газардам і Кэнам Шмальцам у рэдакцыі «Беларускага універсітэта», на біялагічным факультэце, у клубе «Палітыкус», інтэрнаце № 6. А госці? Яны таксама не з сарамлівых. І пыталіся не толькі пра лекцыі: «Ці можаце вы гаварыць услых тое, што думаеце? Як праходзяць дыскусіі аб перабудове? Якога плана сацыяльныя гарантыі прапаноўвае моладзі камсамол?»

— Мы не разлічвалі, што будуць такія адкрытыя і шчырыя гутаркі,— прызнаюцца потым Кэн і Дэвід.— Нам здаецца, што гэта таксама адзін з паказчыкаў, як хутка ідзе ў вас перабудова.

— Аб чым шкадуеце, адлятаючы дадому?

— Аб тым, што не валодаем рускай мовай. Не змаглі наведаць лекцыі і параўнаць якасць вышэйшай адукацыі ў Савецкім Саюзе і Канадзе,— сказаў Дэвід.

— Мне вельмі спадабалася руская мова. Абавязкова буду яе вучыць,— паабяцаў Кэн.

Першыя ўрокі ён засвоіў добра. Развітваліся мы па-беларуску: «Да пабачэння!»

М. ПЯТРОВА.

Я ЎБАЧЫЎ...

Прагрэсіўнае вырашэнне пытанняў

Жыццё ў Савецкім Саюзе, канешне, поўнасцю адрозніваецца ад штодзённых спраў жыхароў Паўночнай Амерыкі. З шэрагам асаблівасцей сутыкнулі ся мы, як толькі сышлі па трапу самалёта ў Маскве.

Першая з іх — невялікі (у параўнанні з іншымі галінамі эканомікі) працэнт працуючых у сферы паслуг. Гэта добра адлюстроўвалі чэргі ў магазінах і невялікая колькасць рэстаранаў, якія б прагнулі гасцінна расчыніць перад намі дзверы.

З другога боку (і апошнім часам менавіта ён развіваецца больш), жыццё ў Савецкім Саюзе мае нямала пазітыўных аспектаў. Кожны тут можа прымаць удзел у палітычным лёсе краіны. Мне ў час нашага наведвання Мінск здаваўся горадам, які захліснула хваля палітычнай дыскусіі. Дыскусіі ў аўдыторыях, студэнцкіх клубах, дыскатэках, кафэ, на стадыёне. Такім чынам, у нас была не адна магчымасць упэўніцца ў тым, як прагрэсіўна вырашаюцца палітычныя пытанні ў Савецкім Саюзе.

Вельмі цяжка параўноўваць гэтую хвалю з апатыяй, характэрнай для насельніцтва Канады, якое складана скалануць.

Год 1989 дазволіў мне выпрацаваць уласны погляд на гісторыю СССР, лёс і магчымасць поспеху перабудовы.

Як маладому чалавеку і канадскаму студэнту мне важна было ўбачыць беларускіх студэнтаў — людзей, якія адыгрываюць вялікую ролю ў тым, што можна назваць адной з найбольш знамянальных падзей свету другой паловы дваццатага стагоддзя.

Як чалавек з Захаду я цікавіўся: які ж сапраўдны, не газетны, поспех рэальна становішча канадскіх студэнтаў мае адрозненні ў лепшы бок.

Аб вашых справах, праблемах і іх вырашэннях я паспрабую расказаць у сябе на радзіме. Вы, магчыма, нават не ўяўляеце, якая колькасць людзей імкнецца даведацца праўду пра тое, што адбываецца ў амаль невядомай там Беларусі і ва ўсім вялікім Савецкім Саюзе.

ДЭВІД ГАЗАРД,
сарэдактар газеты «Гонтліт» (Канада).

Я ЎБАЧЫЎ...

Дэбаты на... дыскатэцы

перабудовы?

Адзін украінскі рабочы, якога я сустрэў тут, бачыць яго ў тым, каб памылкі мінулага ніколі не паўтарыліся.

Адкрытасць студэнтаў у гутарках аб перабудове і сваім месцы ў ёй здзівіла мяне не менш, чым тое, што ў Канадзе студэнты даўно ўспрымаюць як звыклы падарунак правы, якія беларускія студэнты толькі пачынаюць рэалізоўваць.

Многае з таго, чым зараз карыстаемся мы, было дасягнута нашымі папярэднікамі. Таму я лічу, не без падстаў, што вынікі сённяшняй дзейнасці студэнтаў БДУ адчуюць тыя, хто прыйдзе пасля.

Я быў уражаны, калі зразумеў, што палітычныя дэбаты ў вас часам праходзяць нават у такім месцы, як дыскатэка.

Студэнт Кэн Шмальц сказаў бы: я быў узбуджаны і зацікаўлены тым, што ўбачыў у Беларускім універсітэце. Але журналіст Кэн Шмальц больш насцярожаны. Ён заўважае, што

КЭН ШМАЛЬЦ,
сарэдактар газеты «Гонтліт».

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

Сёння мы ўпершыню запрашаем вас у «Мастацкую гасцінную. Мы рады ўсім, хто стане яе наведвальнікамі. Але чакаем ад вас і больш актыўнага ўдзелу, чым проста чытанне нашай старонкі. Бо свет мастацтва неабсяжны і адначасова зусім маленькі — той, што жыве ў душы і розуме аднаго чалавека. Дзяліцеся сваім светам: захапленнем і абурэннем, радасцю і ўзбагачэннем — усімі ўражаннямі, думкамі, адкрыццямі, якія падарыць вам кінафільм або канцэрт любімага выканаўцы, тэатральная пастаноўка або мастацкая выстаўка. Мы ў сваю чаргу абяцаем знаёміць вас толькі з цікавымі падзеямі і асобамі, што з'яўляюцца ў свеце мастацтва. Да новых сустрэч у «Мастацкай гасцінай»!

АД ПЕРШАЙ АСОБЫ

Сціплае абаянне неігравога кіно

У той дзень, 25 студзеня 1989 года, Ленінград выглядаў звычайна. Здавалася, прахожыя не заўважалі рэкламных надпісаў: «Пасланне да чалавека». І Міжнародны кінафестываль неігравога кіно». Але нас, членаў кінаклубаў розных гарадоў краіны, гэта падзея захапіла адразу. Мы глядзелі конкурсныя і пазаконкурсныя фільмы ў кінатэатры «Масква» — тут быў арганізаваны асобны паказ. У нас нават было ўласнае журы.

За сем фестывальных дзён самымі ўпартымі членамі кінаклубаў было прагледжана каля 60 фільмаў. Адбылося 14 сустрэч з прадстаўнікамі кінематаграфій розных краін, з вядомымі кінадакументалістамі Леа Гурвіцам (ЗША), Эрвінам Ляйзерам (Швейцарыя), Аляксандрам Сакуравым (СССР).

Пачалося ўсё з фільма Крыса Маркера «Чырвонае паветра» (Францыя). Гэта вялікі збор кінадакументаў, якія ў недалёкім мінулым забаранілі б дэманстраваць: матэрыялы пра драматычныя падзеі ў Чылі і Чэхаславакіі, пра эпоху Мао і рэвалюцыю на Кубе.

Фестывальны марафон толькі пачынаўся. Наперадзе яшчэ было некалькі сустрэч са стужкамі, якія адкрылі нам свет такіх вялікіх дзеячоў мастацтва, як Марк Шагал (фільм канадскага рэжысёра Гары Рацке «Шагал»), савецкі рэжысёр Дзінара Асанава (работа ленінградскага кінадакументаліста Віктара Цітова «Дзінара»), а яшчэ — Ван Гог, Фернанда Бутэра, Разенквіст.

Успамінаючы фестываль, нельга не адзначыць, што яго адметнай рысай быў сум — ён прысутнічаў у многіх стужках. Напрыклад, у італьянскім фільме рэжысёра Рычы Лукі «Ад паўночнага поляса да экватара», дзе ёсць шмат старых кінакадраў, сведак першых крокаў кінамастацтва, што патроху губляюцца ў патоку інфармацыі і якаснай плёнкі.

Поўная процілегласць гэтай стужкі — пампезны фільм, нават кінасімфонія «Чары жыцця» (ЗША, рэж. Готфры Рэджыё). Тут ёсць тэхнічная вышыня, але не хапае чалавечнасці, шчырасці.

Фільм заходнегерманскіх рэжысёраў Т. Бергмана і М. Попа «Пацёмкінскі горад» — гэта інтэлектуальны, драматычны расказ аб трагедыі нашага стагоддзя— адзіноце, непрыкаянасці людзей.

Фестываль падарыў нам яшчэ шмат запамінальных сустрэч з дакументальным кіно. Але, на жаль, нашаму, кінаклубаўскаму, журы давялося падводзіць вынікі ў вялікай спешцы. Таму не ўсе былі згодны з прысуджэннем нашага ўласнага галоўнага прыза фільму «Чары жыцця». Ды і сама цырымонія ўзнагароджання праходзіла пры паўпустой зале і таксама ў спешцы. Другое месца мы аддалі фільму рэжысёра з Рыгі Іварса Селецкіса «Вуліца Папярэчная».

А на наступны дзень усё зноў было па-ранейшаму: раптам зніклі фестывальныя афішы і плакаты, быццам і не было свята. Але так многа пакінула яно ў нашых сэрцах...

І. СУКМАНАЎ.

СУСТРЭЧА СА СТАРОЙ ЗНАЁМАЙ

Як справы, пані Моніка?

Вы, безумоўна, добра памятаеце вельмі папулярную некалі тэлеперадачу «Кабачок «13 крэслаў». Адзін старанны аматар дакладных лічбаў правёў жартоўную статыстыку. Ён падлічыў, што за 15 год існавання перадачы на экране было выпіта 16789 кубачкаў кавы, выканана 6 728 песень і выказана 2 727 жартаў (два з іх — удалыя). Кабачок ужо даўно закрыўся, але многім цікава было б даведацца, як склаўся далейшы лёс яго былых наведвальнікаў. У пані Монікі, напрыклад.

— Справы мае, слава богу, ідуць нядрэнна,— гаворыць яна.— Дзякуй добрым людзям — яшчэ памятаюць, пазнаюць у магазіне, у іншых грамадскіх месцах. Часам гэта вельмі стамляе, хочацца пабыць непрыкметнай, звычайнай жанчынай. Асабліва ў транспарце цяжка. Тут ты на віду, і пакуль даедзеш да свайго прыпынку, пасажыр, што пакутуе ад нудоты, паспее цябе пазнаць. Таму аднойчы я вырашыла: у грамадскі транспарт больш ні нагой!

— Як жа вы без яго абыходзіцеся?

— Вельмі проста. Я сама села за «баранку» — у мяне з'явіўся ўласны аўтамабіль. Мабыць, мне ніколі не зразумець, чаму ён едзе, чаму колы круцяцца, але нешта я ўсё ж магу. Вы памятаеце фільм «Сцеражыся аўтамабіля», дзе я выконвала ролю вадзіцеля тралейбуса? Перад тым, як здымацца ў гэтым фільме, я прайшла курс навучання ў аўташколе. Там я езджу па горадзе, а гэта, самі разумееце, не жартачкі.

— Як вы ставіцеся да эмансіпацыі жанчын у тым сэнсе, што яны даўно авалодалі прафесіямі, якія раней лічыліся прывілеямі мужчын?

— Я не лічу прафесію вадзіцеля «прывілеяй» мужчын, як вы выказаліся. А вось калі бачыш на вуліцы жанчыну-будаўніка, якая цягае камяні, жанчын у гэтых аранжавых жылетах... Краіна не павінна такое дапускаць.

— Што вы больш за ўсё цэніце ў жанчыне?

— Жаноцкасць... у спалучэнні з мужчынскім розумам.

— А ў мужчыне?

— Добрыя адносіны да жанчыны. Думаю, гэтымі адносінамі вызначаецца і ўзровень яго культуры, і выхаванасць, і ўсё астатняе.

— Як вы праводзіце свой вольны час? Вам да спадобы быць гаспадыняй?

— Шчыра вам прызнаюся, кухня не самы любімы мой занятак. Але проста пабыць дома вельмі люблю. Нікуды не спяшацца, не апранацца, не прычосвацца, не грыміравацца. Дома я адпачываю. Люблю пачытаць кнігу, паглядзець тэлевізар, запрасіць каго-небудзь у госці.

— У вас ёсць добрыя сябры?

— Шмат сяброў. Па суседству, напрыклад, жыве журналістка Лара Аграноўская, паэт Саша Межыраў. Ёсць нават своеасаблівы калега па сатырычнаму жанру — пісьменнік Аляксандр Курляндскі.

— Магчыма, ён і піша для вас па-суседску?

— Усе гэтыя мужчыны-сатырыкі вельмі абдзяляюць прыгожую палову чалавецтва. Яны пішуць выключна для мужчын. Дастаткова ім сесці пісаць жаночы маналог, і натхнення як не было. Я нават неяк Міхаіла Жванецкага прасіла: напішы хоць ты што-небудзь для мяне. Але ён толькі рукамі разводзіць: не атрымліваецца.

— Вы некалькі разоў былі ў Мінску. Ці падабаецца вам беларуская сталіца?

— Вельмі падабаецца. І нават у апошні мой прыезд, калі надвор'е было невыноснае, з ветрам і мокрым снегам, я атрымала вялікае задавальненне ад сустрэчы з гэтым горадам.

Размову правёў
І. ГУКОЎСКІ,
студэнт факультэта
журналістыкі.
Фота аўтара.

На здымку: Заслужаны артыст РСФСР Барыс Рунге і Народная артыстка РСФСР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі РСФСР Вольга Аросева.

МУЛЬТЫПЛІКАЦЫЯ — ДЗІЎНЫ СВЕТ!

Свавольніку і любімцу дзятвы Мікі Маусу споўнілася ... 60 гадоў. Але ён па-ранейшаму юны, любімы, жыццярадасны. Усё яго жыццё — поспех, трыумф, пакланенне. Магчыма, таму, што яго стваральніку Уолту Дзіснею на шляху да нараджэння Мікі давялося адчуць і хвалюючае пачуццё ажыццяўлення задуманага, і горыч расчаравання...

Майстар і яго герой

У ВОСЕМ гадоў Уолт зарабіў першую ў сваім жыцці нікелевую манетку, намаляваўшы любімага жарабца вясковага ўрача. Ён вучыўся маляванню ў школе, розных прыватных установах, якія насілі гучныя назвы: Мастацкі інстытут, Акадэмія прыгожых мастацтваў...

Уолт Дзісней спрабаваў працаваць карыкатурыстам у газеце, мастаком рэкламы... Але свет пасля Першай сусветнай вайны перажываў цяжкія часы эканамічнага крызісу. Мастакі, якія малявалі забаўныя сюжэты, не вельмі патрэбны былі дзяльцам. Тыя жадалі «рабіць грошы»...

Аднойчы Дзісней убачыў у газеце аб'яву аб адкрыцці ў Канзас Сіці фірмы кінарэкламы. Яму захацелася ствараць кароткаметражныя фільмы. Уолт выпрошвае дадому мультыплікацыйны апарат і начамі, у гаражы стварае свой першы фільм «Смехаграма» — сам і мастак, і сцэнарыст. Паглядзеўшы яго, упраўляючы даў заказы на яшчэ некалькі кароткаметражак. Справы пайшлі так добра, што Уолт праз некаторы час вырашыў адасобіцца ад «Кінарэкламы Канзас-Сіці». Так яшчэ нядаўні хлопчык стаў прэзідэнтам уласнай фірмы «Смехаграмкарпарэйшн», якая мела сваіх прадстаўнікоў у Нью-Йорку. Аднак малады Уолт Дзісней быў не зусім вязучым бізнесменам: у 1923 годзе ён зноў аказаўся практычна без сродкаў для існавання.

Галівуд у той час ужо паспеў стаць казачным краем, дзе спаўняліся самыя неверагодныя жаданні. Дваццацітрохгадовы Дзісней вырашыў, што іменна тут, у Галівудзе, ён павінен стварыць свой Лёс. Ён прывёз у гэты кінагорад свой новы фільм — «Аліса ў маляванай краіне» і даў у газетах шмат аб'яў— прапаноў прадаць кінастужку.

Забаўная дзяўчынка спадабалася і дзецям, і іх бацькам, але змагла пратрымацца на ўзроўні кінаэскіз ўсяго тры гады. Хутка яе месца заняў трус з доўгімі вушамі і нагамі і хвосцікам у выглядзе гладкай шышкі. Імя яму далі Освальд.

Вушасты трус прынёс Уолту Дзіснею першы сапраўдны поспех. І велізарныя прыбыткі фірме. Яны былі такія вялікія, што неабходнасць у паслугах Дзіснея проста адпала і яго... звольнілі.

І зноў патрэбна было шукаць новы персанаж. Таксама звярка. Але якога?

З лёгкай рукі мастака Пата Салівена па экранах таго часу насіўся хітры прайдзісвет і хуліган кот Фелікс. А што, калі ў процівагу яму — мыш?

Мікі «паявіўся на свет» у 1928 годзе. Ён не быў прыгажунчыкам: вушы — лапухамі, нос — шышачкай, чорныя дыскі вачэй, шчуплае тулава і танюсенькія ножкі ў велізарных чаравіках, пісклявы голас (гэты голас яму падараваў сам Дзісней). Потым у Мікі з'явіцца сяброўка Міні і сябры: качаня Дональд Дак, сабакі Плуто і Гуфі, кот Віллі і інш. Але Мікі Маус першы адлюстраваў найбольш поўна мастацкую манеру У. Дзіснея. Гэта хутчэй была «імправізацыя» мастака на тэмы «мышынага аблічча», смешнае, эксцэнтрычнае пераўвасабленне (велізарныя башмакі — ці не з клаунады?).

Мікі Маус адразу і безагаворачна заваяваў любоў гледачоў усіх пакаленняў. На конкурсах кіназорак ён займаў адно з першых месц сярод жывых артыстаў. Цацкі, жэтоны, шпількі, упрыгожванні, кніжкі, малюнкі, эмблемы, рэклама — відарыс Мікі можна было сустрэць амаль усюды. Гэта — любімы герой людзей усіх узростаў, усіх нацыянальнасцей, усіх саслоўяў. Ён крочыць праз мора і граніцы. У 1935 годзе на Маскоўскім кінафестывалі «Мікідырыжор» і яшчэ дзве стужкі Дзіснея атрымалі трэцюю прэмію пасля такіх карцін, як «Чапаеў» братоў Васільевых, «Юнацтва Максіма» Г. Козінцава і Л. Траўберга, «Апошні мільярдэр» Рэнэ Клера.

У гады Другой сусветнай вайны Мікі Маус, як і многія іншыя персанажы дзіснееўскіх фільмаў, змагаўся з фашыстамі: ён — галоўны герой шматлікіх рэкламных фільмаў на карысць ахвяраванняў на ваенныя патрэбы. Ён жа, намаляваны «на шчасце» на танках і браневіках, дапамагае вызваляць гарады Еўропы.

Сёння Мікі Мауса можна сустрэць ля ўваходу ў дзіўную краіну Дзіснейлэнд, створаную Уолтам Дзіснеем для дзяцей. Бясспрэчна, гэта самы папулярны персанаж мультфільмаў вялікага казачніка XX стагоддзя. Таму ён стаў эмблемай фестываля фільмаў Дзіснея, які праходзіў у нашай краіне ў верасні-кастрычніку мінулага года. Такія ж фестывалі прайшлі і ў іншых краінах, і ўсюды Мікі Мауса і яго сяброў сустракалі цёплымі ўсмешкамі тысячы дзяцей і дарослых.

У чым жа сакрэт папулярнасці Мікі і іншых герояў Уолта Дзіснея? Захоўваючы аблічча, паводзіны жывёл, яны жывуць як людзі. Падзеі, матывы і інтарэсы іх экраннага быту — копія быцця нашага, чалавечага, з усімі слабасцямі, недахопамі, супярэчнасцямі, «мышынай вазнёй». Пры гэтым захоўваецца выключная дакладнасць адлюстравання: усе дробныя дэталі месца дзеяння (ад каморы да Сусвету), аблічча, мімікі, жэстаў персанажаў дакладна распрацаваны і абумоўлены. І кожная дробязь (дарэчы, да Дзіснея на іх ніхто не звяртаў увагі) узмацняе адчуванне праўдзівасці, натуральнасці таго, што адбываецца на экране.

Матэрыял падрыхтавала
Ж. МІХАЙЛАВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
16 сакавіка
Зак. 1615.
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.